# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
15 снежня
1994 года
№ 13(1718)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА


## З мяшка Дзеда Мароза



Амаль 400 падарункаў падрыхтаваў да Новага года прафкам для дзяцей студэнтаў БДУ.

А студэнцкі клуб плануе правесці 29—30 снежня дзіцячыя ранішнікі на філфаку, у падрыхтоўцы якіх бяруць удзел студэнты журфака, юрфака і філфака. Снягуркай будзе кіраўнік універсітэцкага ансамбля «Крыжачок» Наталля Янушкевіч. А вось хто стане Дзедам Марозам — пакуль не вядома.

А 23 снежня адбудзецца фінал КВЗ, прысвечаны Калядам. Пераможцаў чакаюць значныя падарункі, якія — пакуль сакрэт. А тэма КВЗ, як вызначылі арганізатары, гучыць так: «КВЗ — гэта свята, якое заўжды з табою».

АЛЕСЯ Т.

# З Новым годам

● ЧАЛАВЕК ПЕРШАЙ ПАЛАСЫ

## Беларускую журналістыку ратуе замежны студэнт!

*Стрэльнікаў Аляксей — ураджэнец Днепрапятроўска, студэнт факультэта журналістыкі БДУ.*

— **Як ты апынуўся ў Мінску?**

— Я праходзіў службу ў Савецкай Арміі на тэрыторыі Беларусі, і калі ў 1989 годзе выйшаў на волю, на радасцях адправіўся ў падарожжа. Маршрут быў такі: дом — Мінск — Вільня — Рыга — Масква — дом. Калі прыехаў у Мінск, дарэчы, упершыню закахаўся, прычым не ў дзяўчыну.

— **У хлопца?!**

— У Мінск. Не ведаю, чаму. Горад тыповы савецкі. Гісторыя, а галоўнае — душа, знішчана, але штосьці ў ім мяне кранула. Ды настолькі, што калі цяпер прыязджаю дамоў, у Дняпро, пабуду дзень-другі і бегма на цягнік — у Мінск. Тут мне добра. Тут мой дом.

— **А дзе прыгажэй дзяўчаты: у Днепрапятроўску ці ў Мінску? З каго ты сабе будзеш выбіраць сяброўку жыцця?**

— Беларусачкі файныя, але, у адрозненне ад украінскіх дзяўчат, занадта ганарлівыя. Украінкі больш даступныя. Жонку — хутчэй за ўсё з Мінска. Ёсць ужо кандыдатура. Прыглядаюся.

— **Ты дастаткова папулярная асоба на факультэце, у інтэрнаце і г. д. Чым ты гэта тлумачыш: службовым становішчам прафсаюзнага дзеяча, інтэлектам, абаяльнасцю?**

— І першым, і другім, і трэцім. Я купаюся ў гэтай папулярнасці. Аднак гэта перабольшана: у апошні час мой вобраз несупынна змяняецца, і я ўжо не той, які быў два-тры гады таму. Сталею.

— **Ці бывае ў цябе настальгія па дому? Ты ж па тры месяцы не выязджаеш з Мінска. Ці робіш ты нешта, каб тут адчуваць сябе як дома?**

— Я слухаю украінскае радыё і спяваю украінскія песні. Але настальгіі няма: «Мой адрес не дом и не улица, мой адрес — Советский Союз».

— **Шырока вядома твая прыхільнасць да смачнай ежы. Якая твая любімая страва? Любімая беларуская страва? Ты не злоўжываеш алкаголем?**

— Бефстроганаф. Бульбяныя аладкі. Злоўжываю крайне рэдка.

— **Што табе дапамагае жыць (менавіта, з набытага дома) яшчэ, апроч украінскіх песень?**

— Украінскі тэмперамент.

— **Чаму ты пайшоў на журфак? Ты лічыш, што ў беларускай журналістыкі ёсць будучыня? А ў беларускай мовы?**

— Я марыў стаць журналістам, таму што існуе вялізнае поле для дзейнасці па стварэнню сапраўднай журналістыкі. Сёння на Беларусі няма журналізму ў цывілізаваным разуменні. У нацыянальна-дзяржаўным кантэксце — няма наогул. Выключэнне — хіба што «ЛіМ», але гэта тыднёвік, да таго ж вузкапрофільны. Ды «Беларускі універсітэт». А ўсё астатняе — карыкатура на журналістыку. Адным словам, правінцыйны ўзровень. У мовы ёсць будучыня пры ўмове, што да ўлады прыйдуць спадары накшталт віленскіх беларусаў з «Нашай нівы».

— **Алексей, Олэксій, Аляксей! Ты ўжо пяты год жывеш сярод беларусаў, якія станоўчыя і адмоўныя якасці нацыянальнага характару ты вылучыш?**

— Станоўчае — безумоўна, дабрыня, лагоднасць, а адмоўнае — адсутнасць нацыянальнай свядомасці.

— **Ты экзотыка на журфаку?**

— Не. Гістарычны экземпляр. Паступіў акурат перад распадам СССР. На маіх вачах праходзіла станаўленне дзяржаўнай мяжы паміж «братнімі» Беларуссю і Украінай. Калісьці напішу кнігу аб гэтым.



Размаўляў
**А. РАШЧУПКІН.**

## На Калядкі — пякі аладкі...

Вось хутка і прыйдуць да нас Каляды. Свята, якое нясе радасць, шчасце і надзею ў кожны дом. Нездарма ў нашых продкаў з усіх каляндарных святаў яно было самым любімым.

Калядкі — свята, якое вяртаецца да нас. Аднак пры набліжэнні яго мне чамусьці становіцца сумна. Аднойчы ў Нацыянальным музеі амаль гадзіну прастаяла я каля карціны нейкага мастака пачатку нашага стагоддзя, на якой была намалявана калядная ёлка, упрыгожаная васкавымі анёламі. І раптам мне здалося, што Каляды або свята Раства Хрыстова нібыта было скрадзена ў нас, бо ні мы, ні нашыя бацькі не зведалі ўсёй радасці яго святкавання. А продкі нашы святкавалі Каляды ў агульнай любові і міласэрнасці, спявалі традыцыйныя песні і выконвалі абрады, якія перайшлі ім ад іх прадзедаў. Цікава, што гэтае свята з'яўляецца цудоўным спалучэннем народнай язычніцкай і хрысціянскай традыцыі. Адсюль і ўрачыстыя набажэнствы ў цэрквах пад час Каляд, святочныя малітвы, калядная варажба, батлеечныя відовішчы.

Мы праводзілі стары і сустракалі Новы год з ёлкай і падарункамі пад ёй. І не ведалі, што для нашых продкаў галоўным было не свята Новага года, а менавіта евангельскае паданне пра цудоўнае нараджэнне немаўлятка Ісуса, пра цярплівую Марыю, пра дзіўную Віфліемскую зорку, якая ўзышла на небе...

І менавіта ў калядную ноч чалавек разумее ўсю значнасць свайго існавання, напаўняе жыццё сваё надзеяй і любоўю да блізкіх яму людзей, да маці, да прыроды, да Бога... І нездарма ўжо на працягу стагоддзяў да тэмы Раства Хрыстова звярталіся знакамітыя мастакі, скульптары, паэты ўсяго свету, таму што ідэя дабра, міласэрнасці і самаадданасці жыла і будзе жыць стагоддзямі.

У калядную ноч усё немагчымае робіцца магчымым. Усё нежывое ажывае, прырода думае і гаворыць людской мовай. Дзве веры спалучыліся ў беларусаў: вера прашчураў, традыцыі, якія пераходзяць з пакалення ў пакаленне, і вера хрысціянская. Мабыць, таму з Калядамі звязана вялікая колькасць паданняў і легенд. І абрады ў калядных святах носяць абарончы характар, таму што маюць магічную сілу адганяць усялякую «нечысць», якая асабліва актыўная ў гэтыя святочныя дні.

А вось свята да нас ідзе, і тры куцці падступаюць да нашай хаты. Свята пачынаецца поснай куццёю, дзе ўжываецца толькі алей. Гэтым людзі сведчаць падзяку зямлі за яе дары. Другая куцця — багацей за першую. Шчодрая яна. Нездарма гэтую куццю ў народзе звалі тоўстай: у цэнтры заўжды красуецца пірог — нібыты сонейка, а побач — аладкі і мясныя стравы. Гаспадар з гаспадыняй зычаць адзін аднаму багацця і раскошы ў хаце. Таго ж самага жадае ім і дружына калядная, якая ўжо пад акенцам спявае: «Пладзіціся будуць ягняты, цыпляты і куры, бо вунь як Каза пладаносна скача, тупача, вылазіць са скуры. І род не звядзецца: як грыбы, нарастуць немаўляткі; паходжвае Бусел па хаце, кагось дзеўбане для парадку».

«З нагі чаравік праз плот, як праз мост, закідае — нарачонага кліча дзяўчынка маладая».

«Пад вокнамі ціхаю белаю зданню блукае: а, мабыць, пачуўшы імя, жаніха адгадае».

Варожаць дзяўчынкі пра свой лёс. Ходзяць у хлеў і ловяць у цемры авечак: калі зловіць барана — выйдзе замуж, а калі авечку — не. Варожаць аб жыцці і смерці, аб багацці і беднасці, імкнуцца зазірнуць у будучае і добраахвотна паўплываць на яго.

А вось і трэццяя куцця. Яна, як і першая, называецца поснай, галоднай. І яе яшчэ называюць вадзяной — святога Вадохрышча знак. Нельга хрышчэнне прымаць, калі поўнае пуза. Святыя часіны не ежаю — духам багаты.

Хутка прыйдуць Каляды... Мабыць, для кагосьці яны паранейшаму застануцца незаўважанымі. Аднак не хацелася б, каб адбывалася так, бо свята гэтае на ўвесь год напаўняе жыццё асаблівым сэнсам, жыццём, дзе кожны мае сваё месца...

А. Т.



● БЯРЫ ДА ГАЛАВЫ

**У рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт» прыйшоў ліст з Амерыкі ад некамерцыйнай арганізацыі New Era Students Services, якая можа бясплатна выслаць замежным студэнтам адрасы амерыканскіх універсітэтаў, што плоцяць стыпендыю. А таксама можа выслаць інфармацыю аб рэгістрацыі ў любым універсітэце ЗША, размяшчэнні студэнтаў, падарожжах, сустрэчах студэнтаў у Лос-Анжэлескім міжнародным аэрапорце, экскурсіях. І ўсё гэта па нізкіх цэнах для студэнтаў.**

**Для таго, каб атрымаць дадатковую інфармацыю пра ўсё вышэйназванае, трэба напісаць на адрас: New Era Students Services, 20231 Stagg street, Canoga Park, CA 91306, U. S. A.**

У канверт трэба ўкласці канверт са зваротным адрасам і паштовы купон для адказа.



● НАТАТКІ З ВЫСТАВЫ

# Чым трэба ганарыцца

***Беларусь будзе, калі будзе жыць беларуская мова, і можа не быць, калі знікне мова, не дамо ёй знікнуць, калі мы хочам жыць!***

***В. БЫКАЎ.***

Каб адзначыць Дзень беларускага друку і пісьмовасці, які святкаваўся 1 верасня 1994 г., на ўсіх факультэтах універсітэта былі праведзены лекцыі і выставы.

Выстава, якая наладжана ў памяшканні філфака БДУ, праходзіць пад назвай «Любіць Радзіму, шанаваць родную мову». Яе арганізаваў старшыня клуба «Спадчына», супрацоўнік філасофска-эканамічнага факультэта Анатоль Яфімавіч Белы пад эгідай дэкана Альберта Мікалаевіча Елсукова.

Цудоўныя творы беларускага мастацтва з асабістай калекцыі А. Я. Белага прадстаўлены экслтбрысамі, шаўкаграфіяй і карцінамі М. Рыша, Г. Грака, Ф. Шантыра, А. Буновіча, М. і У. Басалыгаў, Э. Агуновіча і інш.

Асаблівую ўвагу звяртаюць на сябе творы Яўгена Бусла. Гледзячы на яго карціны, ніхто нават і не падумае, што ў гэтага чалавека няма рук. Сюжэтамі для карцін паслужылі народныя прыказкі і прымаўкі «Зяць любіць узяць», «Быў час, калі дзеўкі любілі і нас», «Хто скуль, а мы тутэйшыя», «Татава хата ўсім багата», «Няма тае крамы, каб прадаваліся мамы».

Хочацца сказаць і пра творы У. Басалыгі. Ён распачаў серыю работ «Мова наша родная», дзе паказаны яго асацыяцыі з літарамі беларускага алфавіта. Такога ніхто ў свеце яшчэ не рабіў, і прыемна ўсведамляць, што аўтар гэтых карцін — беларус.

Наогул, усе творы гэтай выставы пакідаюць добрыя ўражанні.

Выказаў свае думкі А. Я. Белы і наконт помнікаў Францішку Скарыну і Міколу Гусоўскаму, зробленых у медзі на сродкі, сабраныя клубам «Спадчына». Помнікі нашым знакамітым продкам, пастаўленыя каля параднага ўваходу ў галоўны корпус Белдзяржуніверсітэта, падымалі б аўтарытэт універсітэта і ўвогуле нашай дзяржавы. Гэта паказала б усім, што мы, беларусы, не саромеемся нашай спадчыны, а наадварот — ганарымся ёю.

Валерыя **АЎСЯНІК**.

● З НАГОДЫ ЮБІЛЕЯ

# ЛЕТАПІС ГЕАФАКА

**1923 г.**

На педагагічным факультэце БДУ арганізаваны кабінет мінералогіі і крышталяграфіі на аснове асабістай калекцыі акадэміка АН БССР М. Ф. Бліадуха.

**1934 г.**

Адкрыты геолага-глебавагеаграфічны факультэт.

**1937 г.**

Факультэт перайменаваны ў геаграфічны.

**1938 г.**

Пачатак падрыхтоўкі навуковых кадраў географаў праз аспірантуру. Першымі аспірантамі былі М. Т. Рамаgоўскі, І. І. Трухан, А. С. Акінчыц.

**1940 г.**

Выдадзены першы кароткі геаграфічны нарыс БССР У. А. Дзяменцьева і Я. Г. Ракава.

**1945 г.**

Першы пасляваенны выпуск географаў (9 чалавек).

**1952 г.**

Выдадзены першы навуковы дапаможнік для ВНУ па геаграфіі Беларусі У. А. Дзяменцьева і М. Т. Рамаgоўскага.

**1954 г.**

На базе факультэта створана Геаграфічнае таварыства Беларусі.

**1958 г.**

Навукоўцы факультэта — рэдактары і аўтары многіх карт упершыню выдадзенага «Атласа БССР».

**1960 г.**

Адкрыта вячэрняе аддзяленне геаграфічнага факультэта.

**1971—1973 гг.**

Пабудавана вучэбна-геаграфічная станцыя «Заходняя Бярэзіна» ў Валожынскім раёне.

**1976 г.**

Факультэт прымаў групу ўдзельнікаў 29 Міжнароднага геаграфічнага кангрэсу.

**1978 г.**

Пачалося будаўніцтва Браслаўскага навукова-даследчага лімналагічнага стацыянара ў вёсцы Слабодка Браслаўскага раёну.

**1983 г.**

На факультэце адкрыта чытальная зала геаграфічных навук.

Факультэт удзельнічаў у арганізацыі работы Першага Міжнароднага кангрэсу па біясферных запаведніках.

**1990 г.**

Выдадзены «Атлас Беларускай ССР» (старшыня рэдкалегіі прафесар Р. А. Жмойдзяк).

**1991 г.**

Створана новая экспазіцыя Музея землязнаўства.

**1994 г.**

Адкрыты новыя спецыяльнасці «Экалогія» і «Геалогія і выкарыстанне карысных выкапняў».

# СПЫТАЕМ У ДЭКАНАЎ

*Напярэдадні Новага года супрацоўнікамі газеты «Беларускі універсітэт» было праведзена апытанне дэканаў. Усіх іх мы прасілі адказаць на два пытанні:*

*1. Якая падзея на вашым факультэце была сёлета самай значнай, на Вашу думку?*

*2. Які карнавальны касцюм ці маску Вы насілі на Новы год у дзяцінстве?*

*І вось якія адказы мы атрымалі...*

**СЛУКА Алег Георгіевіч, дэкан факультэта журналістыкі:**

1. Самая значная падзея для журфака — гэта, безумоўна, 50-годдзе. А ў наступным годзе хацелася б, каб журфак атрымаў будынак па вуліцы Маскоўскай. Тады б мы арганізавалі камп'ютэрны клас, адкрылі тры аддзяленні, прыцягнулі вядомых выкладчыкаў Беларусі і Заходняй Еўропы.

2. Чаго хітрыць, я быў клоунам на навагоднім балі два разы, у 9 і 10 класах. Быў паэтам, пісаў смешныя рэпрызы, таму і граў клоуна.

**ПРЫМАЧУК Леанід Платонавіч, дэкан механіка-матэматычнага факультэта:**

1. Самае прыемнае ў гэтым годзе тое, што з 159 студэнтаў V курса 47 прэтэндуюць на дыплом з адзнакай.

2. Касцюм. астролага. У першым ці другім класе я нават атрымаў за яго першую прэмію.

**КЛІШЧАНКА Анатоль Пятровіч, дэкан фізічнага факультэта:**

1. Гэты год для факультэта быў дастаткова радавы. Але вельмі прыемна тое, што пры ўсёй шэрасці будняў наш факультэт застаецца яшчэ нейкім астраўком надзейнасці ў навучанні і захаванні патэнцыялу. Гэта дае мне ўпэўненасць, што мы зможам выжыць. Такім чынам, вынік гэтага года — надзея.

2. У наш час амаль усе маскарадныя навагоднія касцюмы ўвасаблялі герояў кнігі «Прыгоды Бураціна» і мультфільмы, героямі якіх былі ўсемагчымыя клоуны. Напярэдадні Новага года мама са шматкоў тканіны шыла мне шырокія шаравары і куртачку. З паперы рабіўся каўпак — і касцюм клоуна гатовы. Гэта быў мой адзіны навагодні касцюм, і, напэўна, яго можна назваць любімым.

**МУЛЯРЧЫК Сцяпан Рыгоравіч, дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі:**

1. Галоўная падзея — з гэтага года ажыццяўляецца падрыхтоўка па дзвюх спецыяльнасцях — радыёфізіка і фізічная электроніка. Для мяне ж асабіста — тое, што мой намеснік Варатніцкі Юрый Іосіфавіч стаў намеснікам першага прарэктара БДУ па інфарматыцы.

2. Маё дзяцінства было звязана з вайной. Мы марылі не пра маскарадны, а ўвогуле пра добры касцюм.

**ЕЛСУКОЎ Альберт Мікалаевіч, дэкан філасофска-эканамічнага факультэта:**

1. Тры новых аддзяленні адкрыліся на ФЭФе за гэты год: міжнародных эканамічных адносін, эканомікі і кіраўніцтва вытворчасцю і аддзяленне культуралогіі. Адбыўся першы выпуск сацыёлагаў. З'явілася болей магчымасцей пасылаць студэнтаў за мяжу. Сацыялагічная лабараторыя факультэта выйшла на разнастайныя міжнародныя цэнтры і ажыццяўляе з імі сумесныя праекты.

2. На навагоднім вечары быў кімсьці кшталту Ката ў ботах, але ўвогуле хацеў быць касманаўтам.

**КАРОТКІ Уладзімір Георгіевіч, намеснік дэкана філалагічнага факультэта:**

1. Самая галоўная падзея на факультэце — адкрыццё аддзялення класічнай філалогіі. Гэта ўпершыню за гісторыю Беларусі. Аддзяленне рыхтуе спецыялістаў па грэчаскай і лацінскай мовах.

2. А што тычыцца маскараднага касцюма... Калі для многіх дэканаў і ўвогуле дарослых навагодні ўбор так і застаўся ў далёкім дзяцінстве, то я дагэтуль то Кашчэем, то турэцкім студэнтам з'яўляюся на святах. Апошні раз — у 1993 годзе на сустрэчы з выпускнікамі. Але мяне яшчэ ведаюць і як Леніна.

**ШУПЛЯК Пётр Аляксеевіч, дэкан гістарычнага факультэта:**

1. Самая знамянальная падзея за гэты год — юбілей факультэта і першы выпуск студэнтаў аддзялення міжнародных адносін.

2. На школьным навагоднім вечары настаўніца прапанавала мне сыграць Пячорына. На мне быў фрак, цыліндр, я прамаўляў нейкія маналогі... Я быў вельмі рады, што менавіта мне прапанавалі гэтую ролю.

**ЦІКАВЫ Вадзім Фёдаравіч, былы дэкан хімічнага факультэта:**

1. Для мяне самым галоўным было тое, што я перастаў быць дэканам, сёлета скончыўся мой тэрмін знаходжання на гэтай пасадзе.

2. Вучыўся ў сельскай школе пры газавых лямпах. Ніякіх мерапрыемстваў, на жаль, не было.

**ШАДЫРА Алег Іосіфавіч, дэкан хімічнага факультэта:**

1. Асноўная падзея — адрамантавалі, нарэшце, прыбіральні.



2. У дзяцінстве я меў мянушку «Слон». Я вельмі люблю шахматы, і мяне так назвалі ў гонар шахматнай фігуры. А на маскарад я ніколі не хадзіў.

**ШУКАНАЎ Адам Сямёнавіч, дэкан біялагічнага факультэта:**

1. Цяжка вылучыць адразу. Відаць, тое, што два выкладчыкі і група студэнтаў атрымалі Сорасаўскія прэміі і стыпендыі адпаведна.

2. У педвучэльні ў мяне быў касцюм Пушкіна: фрак, цыліндр,— які мы абаранялі разам з касцюмам Таццяны.

**ЖМОЙДЗЯК Расціслаў Афанасьевіч, дэкан геаграфічнага факультэта:**

1. 60-годдзе факультэта і звязаныя з ім мерапрыемствы. З гэтага года адкрыты набор на спецыяльнасць экалогія і аддзяленне геалогіі.

2. У педвучэльні мы ставілі «Рэвізора» Гогаля, я граў Хлестакова.

**КАЗЛОЎ Міхаіл Кандратавіч, намеснік дэкана юрыдычнага факультэта:**

1. Няма ніякіх падзей, жывём ціха. Святаў не было, а вось у верасні наступнага года будзе 70-годдзе нашага факультэта.

2. Не было святаў пасля вайны: не было грошай, каб паставіць елку ў школе, галодныя хадзілі, жабравалі...

**КАРЗЮК Віктар Іванавіч, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі:**

1. Самай значнай падзеяй сыходзячага года на нашым факультэце была, безумоўна, двухмесячная паездка ў сярэдзіне лістапада групы студэнтаў і выкладчыкаў у ЗША. Для навучаныя там у школе бізнесу і бізнес-інкубатары ў Каліфарнійскім Дзяржаўным універсітэце.

2. У школе, недзе да сёмага класа, на Новы год мы заўсёды выступалі з пастаноўкамі навагодніх п'ес, у якіх дзейнымі асобамі былі звяры. А я заўсёды граў воўка.

# ВАС ЧАКАЕ МАЛАДЗЁЖНЫ ЦЭНТР





Новы год — гэта не толькі святочны стол, бліскучая елка, доўгая зімовая ноч. Гэта заўсёды падвядзенне вынікаў за мінулы год і складанне планаў на наступны. Сёння, напярэдадні Новага 1995 года, аб тым «што было, што ёсць і што будзе» ў Маладзёжным цэнтры Беларускага дзяржаўнага універсітэта распавядаюць яго сустаршыні — **Іван РАК і Аляксей БАГДАНОВІЧ.**

Як растлумачылі самі хлопцы, Аляксей займаецца ўнутранымі, арганізацыйнымі справамі, Іван — міжнароднымі праграмамі. На пытанне, чаму ў цэнтра два старшыні, адказалі: «У кожнай справе неабходна падтрымка...» Зразумела, што і падтрымка студэнтаў таксама неабходна для Маладзёжнага цэнтра.

**Аляксей:** Ідэя стварэння Маладзёжнага цэнтра належыць не толькі беларускім студэнтам, але і студэнтам-замежнікам. Галоўная мэта — наладзіць зносіны паміж моладдзю розных краін. Адміністрацыя нам ласкава прадаставіла памяшканне кафэ «Гаўдэамус»...

**Іван:** ...дзе раз на два тыдні збіраюцца студэнты, каб разам правесці вольны час, набыць новых знаёмых і сяброў.

**Аляксей:** Да таго ж святочныя дыскатэкі, фестывалі ў Вязынцы, іншыя забаўляльныя мерапрыемствы арганізуюцца менавіта Маладзёжным цэнтрам. І студэнцкія будаўнічыя атрады... Галоўная праблема — адсутнасць фінансаў. Уявіце, колькі грошай патрэбна толькі на тры дні ў Вязынцы, калі нават падключаецца палявая электрастанцыя. З чым хацелася прыйсці ў новы год? Канешне, з новымі ініцыятыўнымі праектамі і абавязкова іх рэалізаваць. Мы хочам наладзіць прамое супрацоўніцтва з маладзёжным цэнтрам «Marketteam» (пры універсітэце горада Гётынген), а таксама ўдзел у маладзёжным фестывалі ў Катавіцэ (Польшча). Ёсць думка арганізаваць такі фестываль у Мінску. Працягваем займацца наладжваннем паездак студэнтаў у Германію, Італію, Францыю.

**Іван:** У сакавіку 1995 года наш цэнтр сумесна з Беларускай Асацыяцыяй клубаў ЮНЕСКО плануе правесці Першы рэспубліканскі студэнцкі форум па сучаснаму менеджменту, галоўнай мэтай якога будзе наладжванне сувязі студэнтаў з іх патэнцыяльнымі работадаўцамі — спонсарамі форуму: фірмай «Дайнова», Мінскім трактарным заводам. Можа крыху забягаю наперад, але зазначу, што рыхтуецца правядзенне і Другога (Міжнароднага) форуму з удзелам фірмаў і студэнтаў Германіі, Англіі, Францыі. Дарэчы, у Германіі існуе цікавы вопыт работы з моладдзю — падтрымка групы студэнтаў, якія праяўляюць ініцыятыву, распрацоўваюць праекты і з гэтымі праектамі прыходзяць у маладзёжны цэнтр. Я лічу, што мы патрэбныя для таго, каб вырашаць пытанні па рэалізацыі гэтых праектаў на ўзроўні дэканатаў, рэктарата. Для студэнта намнога цікавей, калі ён сам рэалізуе менавіта сваю ідэю. Так што чакаем вас, спадары студэнты, з новымі прапановамі.

* * *

Тыя, хто зацікавіўся работай Маладзёжнага цэнтра, маюць магчымасць пазнаёміцца з ім бліжэй 28 снежня 1994 года ў памяшканні Палаца дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41), дзе а 18 гадзіне пачнецца Навагодняе танцавальнае забаўляльнае шоў — тэатралізаванае прадстаўленне, гульні, навагодняе кафэ-бар і грандыёзная дыскатэка. Запрашаюцца студэнты і іншых навучальных устаноў рэспублікі. Білеты можна набыць у фае галоўнага корпуса БДУ.

Маладзёжны цэнтр чакае вас.

**Алена ШАЎКУН.**



## «ЯК СТАЦЬ ГЕНІЕМ»

***Педагогі, неспакойныя бацькі і проста маладыя людзі!***

Звярніце сваю ўвагу на новы твор. У продаж выходзіць кніга, якая не толькі спатрэбіцца вам у вырашэнні розных праблем, але і будзе вашым надзейным праваднікам у жыцці.

Аўтары кнігі «Як стаць геніем» вывучылі лёс соцень выдатных людзей, адкрылі прычыны ўзлётаў і падзенняў творчага жыцця чалавека, нягледзячы на тое, да якой галіны чалавечай дзейнасці яно адносіцца. Аўтары прапануюць згуляць захапляльную шахматную партыю на дошцы, якая называецца жыццём.

Пры ўсіх выдатных якасцях кнігі вас таксама зацікавяць добрае афармленне, каляровая супервокладка. Аб'ём кнігі — 480 старонак, тыраж — 7 тысяч экземпляраў.

Па пытаннях набыцця звяртацца па тэлефонах 20-01-03, 20-38-89.

**Вольга БУКАНАВА,**
**вучаніца гімназіі № 1.**

● ЗЯЛЁНАЯ ВУЛІЦА

## Надзейка Аўчыннікава вучаніца 3-га А класа 101 СШ

## ПТИЦЫ УЛЕТАЮТ



**Опадают листья, птицы улетели,**
**Дома не сидится умным коростелям.**
**В дальнюю дорогу надо отправляться,**
**В стайки-отлетайки стали собираться**

**Утка и гусыня, аист и журавлик,**
**Постепенно стайки строятся в кораблик.**
**Длинной полосою потянулись к югу.**
**С завистью на птичек смотрит кот-ворюга.**

## Зміцер Дзядзенка

***Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» прадстаўляе свайго супрацоўніка Зміцера Дзядзенку, выпускніка філфака БДУ, які прыйшоў у гэтую навучальную ўстанову з жаданнем даць прачытаць хоць каму-небудзь свае творы, а выйшаў з прагай паказаць усім сваю дасведчанасць у творах, напісаных іншымі. «Прахадзімец» (г. з. чалавек, які болей «праходзіў», чым вывучаў) Дзядзенка, атрымаўшы дыплом, стаў свабодна карыстацца сур'ёзнымі іменамі класікаў і разумнымі словамі са слоўнікаў, захаваўшы ў душы прыхільнасць да Ірценьева і Губермана і да наступнай тэматыкі вершаў:***

***Ад Гамера да Дзядзенкі —***
***пра дзявочыя каленкі.***

# ЗАГАДКА ПРАФЕСАРА

## АПАВЯДАННЕ

«...Атвор. Ну, не адкрыты атвор. Проста квадратная адтуліна, і на ёй, амаль поўнасцю прыкрываючы яе, тоўстая пліта з гладкага, па выгляду ледзь не адшліфаванага пясчаніку.

Я спускаўся, і яна спускалася за мною. І я ўжо плюнуў на ўсё. Хай сабе лезе, гадасць такая. Асвятляў толькі прыступкі спачатку сабе, а пасля ў яе пад нагамі, каб часам не капанула носам цэглу.

У гэты момант уверсе нешта тупа і цяжка гакнула, скалануўшы муры і прыкрыўшы амаль усё дзённае святло, што сяк-так тачылася ў люк.

Нібы ў адказ на гэта, струменьчык бітай цэглы, пяску, друзу, нейкіх трэсак ператварыўся ў струмяніска таўшчынёю ў стаўбур сярэдняй велічыні дрыва.

Я быў ужо ў ім, але сходы ператварыліся ў суцэльны

Цяпер я цвёрда ведаю
прычыну
(Таму і цяжка мне, таму й
баліць):
Няцяжка здагадацца, што
мужчыны
Праз пяць хвілін хадзілі
пакурыць.
Потым мужчыны йзноўку засядалі ды складалі план работаў на год... А жанчыны тым часам капалі, пасоўваліся жанчыны наперад.
Яшчэ асобна пакажу
прычыну,
Якая вельмі важная для
нас:
Няцяжка здагадацца, што
мужчыны
Пад вінны склеп падкоп
вялі ўвесь час.
Яны віно мацаванае каўталі...
А гэтым часам жанчыны капалі, пасоўваліся жанчыны наперад...»

Ен ліхаманкава перагорт-

шуметнік, у якім не маглі знайсці апоры ногі. Мне запарушыла аблічча, рукавы былі поўныя пяску.

Зноў цяжка гупнула. Застаўся толькі вузкі, як лязо, праменьчык святла, і ў гэтым святле я заўважыў, як слізнула па паверхні пылавой плыні шкло, досыць вялікі кавалак. Добра, што не ў галаву.

А пасля ахнула нешта ўбаку і праменьчык знік, і, нібы ў адказ на гэтае староннее страсенне, ад якога здрыганулася, здаецца, сама зямля, нешта зноў, у трэці раз, ляснула пад галавой, подзьмухам паветра згасіўшы язычок агню.

— Што там?! — крыкнуў голас унізе.

— Абвал! Пліты рухнулі на лаз.

Я споўз уніз, па калені ў гэтай восыпі з рознага паскудства».

«Легенды пра падземны ход заўсёды жылі ў горадзе. Кожнае пакаленне хлапчукоў марыла знайсці яго. Але не ўсім шэнціла. Тыя, каму ўдалося, не дужа хацелі пра гэта распавядаць. І таму іншыя пра іх не ведалі. Няўдачнікі ж перадавалі паданні наступнікам, пачасту выстаўляючы сябе Тымі, хто трапіў у падземны ход...

Аніхто ужо не памятаў, з якіх часоў вяліся пошукі падземнага хода. Але трывала з рук у рукі перадаваўся і перапісваўся тэкст без заканчэння, які апісваў стварэнне хода. Ніхто не правяраў яго на сапраўднасць. Але і не аспрэчваў яе.

«Легенду чуў я неяк у
маленстве
І памятаю шчэ ад той пары:
Стаялі колісь побач, па
суседству,
Мужчынскі ды жаночы
кляштары.
Мніхам без догляду было цяжка, жыццё ў мнішак — таксама не сіроп... Адно аднаму насустрач яны неяк пачалі падкоп.

Быў цяжкім шлях да сустрэчы на світанку... І мне баліць, але -- як тут не круці! — пракапалі жанчыны дзве трацiны, мужчыны — толькі трацiну таго шляху.

ваў старонкі. Зжаўцелыя рукапісныя аркушы вабілі нейкай таямнічасцю. Так, ён таксама чуў пра падземныя хады, але ніяк не спадзяваўся знайсці згадкі аб іх у архіве прафесара. Праўда, радавацца асабліва няма чаму: пакуль што ёсць вось толькі гэтыя два ўрыўкі. Прычым адзін — з выразнай літаратурнай апрацоўкай і таму не можа лічыцца дакументам, які заслугоўвае даверу. Але ж усё-такі некуды сляды павінны прывесці?..

Ага, ён не памыліўся. Так і ёсць — вось яшчэ аркушы. Гэтыя — з лацінскай лічбай VII.

«— Адкасніся, лайдачына! — адпіхнуў Уладзік сабаку і, ўзяўшы яго за ашыйнік, падвёў да нары.— Лезь, шукай, Куцька, будзь разведчыкам.

Куцька нырнуў у нару. За ім, трымаючы ў левай руцэ ліхтарык, а ў правай рыдлёўку, папоўз Уладзік. Валька патаптаўся на месцы ў нерашучасці, лагодна зірнуў на Геленку, як бы шукаючы ў яе падтрымкі, потым абапёрся на локці і пасунуўся следам за Уладзікам, цягнучы за сабою шэрую сураву нітку.

— Як што якое, дык адразу вяртайцеся,— нагнуўшыся да нары, праказала Геленка, але адказу не пачула.

Уладзік прапоўз некалькі метраў і, калі нара пабольшала, прыўзняўся на каленкі. Куцька таксама спыніўся, насцярожыўся. Праз момант ззаду мільгануў слупок ліхтарыка, і поруч з Уладзікам апынуўся Валька. Яны агледзеліся, асвятляючы вакол ліхтарыкамі.

Так, гэта быў ход, зроблены чалавечымі рукамі, шырынёй метра паўтара. Сценкі — з дзіўнай вузкай цэглы, сцэментаванай шырокімі, з далоню, палосамі раствору. Між цэглы месцамі выступалі пукатыя, даволі вялікія камяні. Над галавой была такая ж кладка. Але чаму столь навісае так нізка, што не выпрастаешся? Адкуль на падлозе набралася столькі гліны і пяску? Уладзік навёў ліхтарык наперад — там, далей, як можна было разабраць, ход зноў звужаўся. Можа, тут дзе-небудзь ёсць якое адгалінаванне? Не, не відаць.

— Што, цікава? — спытаўся Уладзік у Валькі.

— Нічога пакуль такога не бачу. Склеп, і ўсё.

— Склеп, таксама скажаш... Мажліва, мы з табой неўзабаве ўбачым такое, што і ў сне не прысніцца.

— А-а, не спадзяюся,— абыякава буркнуў Валька.

— Дзівак ты, вось што я табе скажу...

— Ну і няхай.

— Ула-а-дзік!.. Ва-а-лька! — як у коміне, пачуўся Геленчын голас.

— Мы тут, Геленка,— адказаў Уладзік.— Прабіраймася далей, Валя... Куцька, наперад! Марш!

Хутка каменная кладка скончылася, і прыйшлося зноў паўзці на локцях. Валька адстаў, і Уладзік мусіў час ад часу адклікаць яго і падбадзёрваць. І як на тое, закапрызнічаў Куцька. Ен пасоўваўся марудна, неахвотна, ціснуўся да Уладзіка і ўсё намагаўся, павярнуўшыся, лізнуць Уладзікаў нос. Уладзік спярша цярпеў, потым не вытрымаў, раззлаваўся:

— Пайшоў ты к чорту, гультаюга, дармаед! — крыкнуў ён на сабаку. А той як быццам толькі і чакаў гэтага — крутануўся ваўчком і прашмыгнуў назад, цірнуўшыся мяккай поўсцю аб Уладзікаў бок».

Далей працягу ізноў не было. Як нейкая зачараваная карціна, пакрытая чорнай фарбай. А праз гэтую фарбу светлымі плямамі выступаюць тры ўрыўкі. Гэта нездарма: прафесар нічым не займаўся, каб толькі забавіць час. Тут ёсць нейкая загадка, якая пакуль што не паддаецца логіцы.

Як жа знайсці адгадку? Магчыма, падкажуць што-небудзь кнігі ды папкі з прафесарскага збору? Толькі дзе ж яны? Ен памятаў, што яшчэ ў апошні свой прыход, пры жыцці гаспадара, кратаў сваімі рукамі старадрукі, якія захоўваліся ў замкнёнай шафе (і яна таксама знікла), праглядаў доўгія, нібы выкладзеныя з цаглінаў, зборы твораў, гартаў старонкі замежных часопісаў... Але цяпер нічога гэтага не было. Госсспадзіі, куды можна падзець такую сціжму кніг? Да таго ж былі яшчэ і папкі, узгадаў ён. У іх прафесар захоўваў... ну так, апрача сваіх асабістыхназіранняў, запісаў, матэрыялаў, яшчэ і выразкі з газетаў і айчынных часопісаў. Папак таксама нідзе не было.

Гэта ўжо пачынала не толькі дзівіць, але і бянтэжыць. Стоп! супакоіцца. Засяродзіцца. Будзем разважаць лагічна. Раз кнігі адсюль прыбралі, значыць, яны без патрэбы. Куды зносяць непатрэбныя рэчы? На гарышча. Ці ў сутарэнне... Сутарэнне! Чаму ж адразу не здагадаўся! Вось ён, ключ да запісаў аб падземных хадах...

Упэўненыя мужчынскія крокі скаланулі цішу сутарэння. Свечка не дазваляла агледзець склеп цалкам, але адсутнасць тут кніг кідалася ў вочы адразу. Што ж, магчыма, прафесар... ну, канешне ж, яны ў схованцы, у падземным ходзе! Нездарма ж адзіная папка ў пакоі захоўвала тыя аркушы. Прафесар любіў такія загадкі.

Але дзе той падземны ход і як у яго трапіць? Прыйдзецца, відаць, агледзець усё — іншага выйсця няма...

Трохгадзінны агляд не даў плёну. Адно што моцна стаміўся — ад пастаяннай саўганіны балелі рукі: прыходзілася ўвесь час адстаўляць ад сценкі то якую скрыню, то стары куфар, набіты ўсялякім ламаччам, то яшчэ якую трасцу...

Праўда, засталася надзея, што ход можа пачынацца з лаза ў падлозе. Таму варта было б агледзець і яе. Але гэта ён вырашыў перанесці на заўтра.

Вывучэнне з наступнай раніцы цэментовай падлогі таксама было безвыніковым. Анідзе ніякай нават шчыліны... Задаў загадку прафесар!.. Ну і настаўнік! Падкінуў задачку па-сяброўску!

Аднак раптам узгадаў, што гаспадара гэтага дома ўжо няма, і папракнуў сябе ў недарэчнай злосці. Адразу ж падумаў, што цяпер ён абавязаны разгадаць загадку, пакінутую прафесарам. Бо ніхто болей гэтым займацца папросту не стане.

Кубачак моцнай кавы дазволіў спакойна паразважаць над сітуацыяй. Сапраўды, кафеін у гэтым духмяным чорным напоі спрыяе рабоце мазгоў...

Значыць, сутарэнні жаданага выніку не далі. Можна, вядома, працягваць пошукі, але трэба ведаць што шукаць... Паспрабуем зайсці з другога боку. Непатрэбныя рэчы, бывае, выносяць на гарышча. Ен жа тады падумаў пра гэта, але забыўся, памкнуўшы шукаць падземны ход. Зрэшты, можа, гарышча і дасць разгадку. Код ад хода (яму спадабаўся каламбурчык).

Усплыла ў памяці даўняя размова. Настолькі даўняя, што ён нат засумняваўся ў яе сапраўднасці. Прафесар казаў, быццам знайшоў людзей, якія хадзілі па падзямеллі, і збіраўся... Што — апісаць? сабраць сведчанні? Не можна было ўзгадаць: ці то



прафесар не дагаварыў, ці то ён сам няўважліва слухаў...

Рыпкія драўляныя прыступкі на гарышча. (Чаму ж кнігі былі вынесеныя з пакоя?) Перад дзвярыма чалавек крыху прыпыніўся: зараз ён будзе альбо трымаць у руках ключ ад таямніцы, альбо атрымае чарговую паразу...

Бібліятэка была на гарышчы. Ен чамусьці адразу паверыў, што тут усе кнігі. Толькі кнігі цяпер не цікавілі. Думка пра загадкавыя сутарэнні завалодала ягонай фантазіяй.

Абмінуўшы шафы з кнігамі, стосы выданняў, складзеных проста на падлозе («ксёнжкі»,— любіў гаварыць прафесар на польскі лад), ён памкнуўся да папак, што ўзвышаліся ў куце.

Разгледзеўшы надпісы на чарговай папцы (прыцемкі гарышча дазвалялі-такі разабраць роўны, чытэльны почырк колішняга гаспадара), ён адкладаў убок: не тое... Ізноў не яно... не, і не гэтая... Вось яна! Тоненькая папачка з акуратнымі літаркамі: «Сутарэнні». Ад хвалявання доўга не мог разабрацца з завязкамі.

Папка была амаль пустая!.. Ен зняможана апусціўся на крэсла. Маснічыны пагрозліва зарыпелі й прагнуліся.

На некалькіх аркушах, што складалі змесціва папкі, прафесар паведамляў, што, пабываўшы ў скляпеннях, вырашыў не давяраць гэтую таямніцу людзям. «Як і кожны вынаходца, я адказваю за лёс свайго адкрыцця, за тое, што яно прынясе людзям: дабро ці зло. Пакуль што існуе большая верагоднасць на зло. Таму я забіраю таямніцу з сабою.

Калі ж раптам хтосьці адкрые хады, маёй віны ў тым не будзе: я знішчыў усе магчымыя падказкі да разгадкі».

Чалавек на гарышчы абурана дачытваў апошнія радкі. Як так можна?.. Чаму?.. Адкуль такое нявер'е ў людзей?.. Дый ці меў прафесар маральнае права на тое, каб, зрабіўшы адкрыццё, свядома прытаіць яго?

Раз'юшаны, ён ускочыў з крэсла. Старыя дошкі гэтага не вытрымалі. Трэск праломленага дрэва, грукат ад бясконцага падзення кніг заглушылі чалавечы ўскрык.

*АД АЎТАРА. З'яўляючыся чалавекам добрасумленным, я мушу прызнацца ў выкарыстанні трох літаратурных крыніцаў пры напісанні гэтага апавядання. Абяцаю ўзнагароду таму, што правільна назаве іх.*

# ЭКЗАМЕН — СПРАВА ТОНКАЯ...

Гэта толькі спачатку прадчуванне здачы экзаменаў кідае ў халодны пот і спрыяе адмоўным эмоцыям. Потым, пасля ўсялякіх выпускных, перавадных, курсавых, дзяржаўных, пачынаеш глядзець на экзамен як на гульню, латарэю, дзе галоўнае не веды і ўменне, а Яго Вялікасць Выпадак. Экзамены палохаюць кожнага, нават добра падрыхтаванага чалавека, бо, як лічаць студэнты, самы вялікі дурань можа спытаць больш, чым самы разумны адказаць.

Усё прыходзіць з вопытам, з часам.

Падрыхтоўка да экзаменаў пачынаецца з напісання шпаргалак. Слова «шпаргалка» ў перакладзе з санскрыцкай мовы азначае «сакрэтны, тайны дакумент». У ёй звычайна запісваецца тое, што не ўлезе ў галаву. Але кожны разумее: часам важная не столькі шпаргалка, колькі яе прысутнасць.

Успамінаецца адзін выпадак здачы заліка. Мы з сяброўкай дамовіліся напісаць «гатовыя» шпаргалкі (трэба яе толькі выцягнуць і разам з ёй ісці адказваць): палову я, палову яна. Адказвалі адна за адной, і шпаргалкі былі напісаны адным почыркам. Галоўнае ў гэтай сітуацыі — менш увагі ўдзяляць паперцы (у вас быў час прачытаць і запомніць), нават схаваць яе пад стол, а аддаваць у замен на залікоўку з выстаўленым залікам. Наш выкладчык вырашыў збіраць аркушы з нашымі адказамі. Праўда, рабіў ён гэта пасля таго, як выставіў нам залікі. Добра, што не наадварот.

Другая справа — пры вусным адказе без падрыхтоўкі. Тут акрамя языка і уласных мазгоў нічога не дапаможа.

Усё гэта к таму, што перш, чым ісці на экзамен, не лішне распытаць у старэйшых курсаў пра выкладчыка, вывучыць яго любімыя творы, прыхільнасці.

Рэдкія выкладчыкі ніяк не рэагуюць на ваш адказ (дарэчы, ім адказваць цяжэй). Пры правільным адказе яны звычайна хітаюць галавой у знак згоды, пры няправільным глядзяць здзіўлена...

...Ведаючы, што выкладчык цікавіцца дэтэктывамі, студэнты «выпадкова» паклалі на яго стол новы дэтэктыўны раман. Экзаменатар спачатку паглядзеў яго, а затым паглыбіўся ў чытанне, а студэнты без турбот апрацавалі свае білеты, выкарыстоўваючы, не таючыся, першакрыніцы.

Увайшоў дэкан.

— Іван Сідаравіч, вы іх бачыце? — кіўнуў ён у бок студэнтаў.

— Здагадваюся... Іх павінны злавіць... — І не падымаючы галавы, дадаў.— Няхай хаця раз у гаду апрацуюць рэкамендаваны матэрыял.

Так што, паважаныя студэнты, вывучайце не толькі прадметы, а і выкладчыкаў, бо псіхалогія — не апошняя справа пры здачы экзаменаў. Быў і такі выпадак.




Адзін з зайшоўшых у аўдыторыю на экзамен студэнтаў забыў залікоўку, і яго сябры прасунулі яе пад дзверы. Выкладчык узяў залікоўку, паставіў добрую адзнаку і такім жа спосабам вярнуў яе назад.

Амаль у кожнай казцы цар задае Іванушку тры самых каверзных пытанні. Відавочна, трымаючыся гэтай старажытнарускай эпічнай традыцыі, студэнтам прапаноўваюць заўсёды адказаць на тры пытанні.

Калі ж вы бачыце, што усё-такі атрымаеце «нездавальняюча», папрасіце выкладчыка задаць вам яшчэ некалькі пытанняў — дома скажаце, што засыпаліся на дадатковых пытаннях.

І галоўнае — у поўнач перад экзаменам выйдзіце на вуліцу і злавіце «халяву». Спачатку «халяву» трэба паклікаць, а калі яна, па вашаму меркаванню, заляціць у раскрытую залікоўку, залікоўку трэба хуценька захлопнуць і перавязаць гумкай. А назаўтра зняць гумку, калі зойдзеце ў аўдыторыю. Паспрабуйце.

Паспяховай вам здачы сесіі.

**Алена ШАЎКУН.**

*Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» прадстаўляе колішняга выпускніка журфака універсітэта, супрацоўніка газеты «Дзеці і мы» Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА-ПІРАГА. Паколькі асноўным яго заняткам з'яўляецца старшынства ў Аргкамітэце нашчадкаў паручніка Ржэўскага, то можа лічыць, што журналістыка для Ўладзя — хобі (за якое, тым не менш, ён чамусьці атрымлівае грошы).*

●●●

● ВОСЬ ТАКІЯ ПІРАГІ

## АПІРАГІЗМЫ



**Ад Пірага. Гэтая мая прадмова наўрад ці патрэбная, але... Але паколькі многае з таго, што я абнародваю, належыць ня мне, а людзям, зь якімі даводзілася так ці йнакш сутыкацца, то я ўжо проста мушу папярэдзіць, што загадзя прашу у іх прабачэньня, калі яны раптам могуць пазнаць свае выказваньні.**

**Зрэшты, усё мною прадстаўляемае сёньня ёсьць набыткам гісторыі, таму — чытайце, шаноўнэнькія чытачыкі! І памятайце, што сёньняшняя публікацыя — толькі частка агульначалавечае спадчыны, зафіксаванае ў апірагізмах. А наколькі ўсё гэтае патрэбна...**

**З пакуль не выдадзенага слоўніка:**

**Апірагізм — цікавае выказваньне, зафіксаванае нейкім Пірагом і толькі таму дайшло да нашчадкаў, у якім ня столькі зырка бачныя памылкі, колькі — спроба з гумарам паглядзець на той сьвет, у якім мусіў жыць ён, у якім мусілі жыць ягоныя сучасьнікі (назоў паходзіць ад уласнага імя фіксатара выразаў).**

«Славянская» адна зь лепшых хварэлак» — сказаў неяк паэт і журналіст Алесь Палынскі.



Фота Міхася ХАМЦА

У Іслачы нейкі паэт сказаў: «Трэба паспытаць усё ў гэтым жыцьці, каб на тым сьвеце карыстацца толькі адабраным».

Нехта з мінулых урадоўцаў: «Я настаиваю от имени, так сказать, личного...»

Перажытачны мінімум.

Адзін з дэпутатаў: «Приходите в комнату №... или кресло №... — в ущерб обеда будем говорить».

Адыдзіце трошкі ад мікрафона — вас не чуваць.

Новыя прадпрыемствы і ўстановы:

— гарматны завод імя Івана Васілевіча Грознага,

— манастыр імя Ўладзіміра Ўладзіслававіча Манамаха,

— агітбрыгада імя Прадславы-Ефрасіньні Ўсяславаўны Полацкай.

Шнапс-капітанъ.

Нядоўга засталося да вялікага сьвята — Дня алхіміка, якое адбудзецца 13.XIII.

Малады паэт Зьм. Дзядзенка прачытаў свой чарговы верш і папрасіў: «Скажы мне што-небудзь пра верш.» — «Што?» — «Праўду; праўда ўпрыгожвае чалавека.»— «Ты хочаш шмат упрыгожваньняў?!»

Навінкі сёньняшняга дня.

Паэт Сяргей Грахоўскі пра аднаго чалавека сказаў, што «ў яго поўны рот дыкцыі».

Радыёжурналіст Віталь Сямашка 21 студзеня 1993 г. сказаў: «...і надзьмуў бровы».

Вядучыя на радыё просяць: «Пабольш удзячных стукачоў!»

Галава — чамадан мазгоў.

Тата і мама вельмі шматдзетныя.

Фатограф Анатоль Каляда: «Стул-самазвал». Гэта пра стул, зь якога ўсе ўпарта падалі (такі ўжо той мэбль...).

Мейсца сустрэчы Пржэвальскага, Міклухі-Маклая, Коля й іншых можна было б назваць «Калье».

«СНД зараз дзейнічае на тэрыторыі Беларусі афіцыйна». Чэснае слова, сам чуў гэтае па радыё...

Афіцэр з вайсковае катэдры БДУ аднойчы заявіў: «Я не буду с вами тут говорить лужёным голосом».

Камюзм сытуацыі.

Мы зараз працуем ва ўмовах нацыянальнага адраджэньня.

Плюнула на ўсё рукою.

«Менш трох не зьбірацца!»

На мяжы грубага палынізма: «А-вы-ню».

Танюша Грынок расказвае 6 лістапада 1993 г.: «У мяне брат... такой... не родной... — но высокий!»

І хлопалі аладкі...

І love you на слове.

Отдел здравоупокоения. Быстро и надежно!

Аб'ява ў канцлагеры:

У Беларусі ёсьць шмат карысных выкапняў — бульба, буракі.

Жыцьцё-выцьцё.

З падручніка па гісторыі СССР 80-х гадоў: «Пятилетку — в четыре гроба. И вообще, у руководства было странное хобби — прокатиться на лафете по Красной площади».

В. П. Шыханцоў, адк. сакратар газэты «Дзеці і мы», пра свайго знаёмага: «Ён ажаніўся ў мінулым годзе. Паўторна».

Сьпявачка Анжэліка Худзік прыводзіць словы сваёй сяброўкі Ірыны Чаркесавай, якая аднойчы сказала: «Мы с ней смотрим на жизнь противоположными глазами».

18 чэрвеня 1994 г. С. С. Ядранцава пачула ў электрычцы: «Хутчэй заносьце вашыя целы ў вагон!»

А. Худзік жа: «Она элегантно сдохла».

Белорусский народ выйдет с большой честью и достоинством из этого испытания.

Не полностью использовал свой потанцевал.



Кацярына ТКАЧЭНКА, карэспандэнт



Вольга ХАДАРЭНКА, карэспандэнт



Таццяна КАЗАК, рэдактар



Марына ГУЛЯЕВА, карэспандэнт

**ВІНШУЮЦЬ ВАС З НОВЫМ ГОДАМ!**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

*15 снежня Зак. 1781. Т. 1000 экз.*

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412 ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

**В. а. рэдактара Т. М. КАЗАК**

*Газета падпісана ў друк у 16.00.*